Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна”
______________ Г.М. Сендзер
«25» 05 2023 г.

# ПРАГРАМА ЎСТУПНАГА ІСПЫТУ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ АТРЫМАННЯ ПАГЛЫБЛЕНАЙ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ (МАГІСТРАТУРЫ) ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 7-06-0232-02 “ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА” З ПРАФІЛІЗАЦЫЯЙ “БЕЛАРУСКАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА”

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

2023 г.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступнага экзамену ў магістратуру складзена ў адпаведнасці са зместам і аб'ёмам абагульняючага курса "Гісторыя беларускай літаратуры", які вывучаецца ва ўніверсітэтах класічнага тыпу. Яна акрэслівае ўзровень падрыхтаванасці, неабходны для ўключэнння спецыяліста-філолага ў даследванне літаратурна-мастацкага працэсу.

**Мэта** магістэрскага экзамену:

– выявіць глыбіню набытых ведаў студэнтамі-выпускнікамі па курсе гісторыі беларускай літаратуры ад старажытнасці да пачатку XXI стагоддзя, прадстаўленым ў аглядавых і манаграфічных тэмах; раскрыць паўнату сфарміраваных уяўленняў пра вызначальныя сацыяльна-гістарычныя культуралагічныя напрамкі і філасофска-эстэтычныя тэндэнцыі развіцця літаратуры, пра заканамернасці змен мастацка-светапоглядных сістэм, зафіксаваных у літаратурных творах, пра функцыянаванне і эвалюцыю ў літаратурным працэсе творчых метадаў, мастацкіх стыляў, жанравых форм; ацаніць творчыя, самастойныя падыходы студэнтаў да асэнсавання мастацкага твора.

**Задачы** магістэрскага экзамену:

– даць мажлівасць выявіць філалагічную эрудыцыю, увесь аб'ём рознабаковых ведаў па тэорыі і гісторыі літаратуры, літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства;

– выявіць узровень прафесійных навыкаў і ўменняў пры вызначэнні гісторыка-літаратурнай значнасці, гуманістычна-філасофскай, светапогляднай, маральна-эстэтычнай каштоўнасцей мастацкага твора;

– паказаць ступень валодання навуковай метадалогіяй пры аналізе фактаў і з'яў літаратурнага жыцця, ступень сфарміраванасці эстэтычных ідэалаў і густаў;

– сцвердзіць прафесійную зацікаўленасць у далейшым даследаванні спецыфікі гісторыка-літаратурнага працэсу на Беларусі і перспектыў яго развіцця ў кантэксце сусветнай культуры.

Змест праграмы магістэрскага экзамену па курсе "Гісторыя беларускай літаратуры" грунтуецца на аснове базавай вучэбнай праграмы, створанай кафедрай беларускага літаратуразнаўства ў 2004 годзе, тыпавой вучэбнай праграмы "Гісторыя беларускай літаратуры XX – пач. XXI ст.", створанай у БДУ (2006 г.). У праграму уключаны таксама пытанні па фальклоры, тэорыі літаратуры і гісторыі літаратурнай крытыкі. У сувязі з гэтым прад'яўляюцца наступныя патрабаванні да ведаў і ўменняў будучых магістрантаў.

Яны павінны **ведаць**:

- шляхі і асноўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры,
- узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры пісьма,
- канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў, сучасныя пераацэнкі твораў папярэдніх эпох,
- тэкст мастацкіх твораў як асноўны аб'ект літаратуразнаўчага аналізу,

- праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці іх кампазіцыі і вобразна-выяўленчых сродкаў,
- герояў твораў, іх светапоглядныя пазіцыі, рысы характару, месца ў сістэме вобразаў,
- сутнасць літаратуразнаўчых катэгорый, тэрмінаў, паняццяў,
- крытычныя і навуковыя даследаванні па творчасці пісьменніка,
- найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў-класікаў.

Будучыя магістранты павінны **ўмець**:

- аналізаваць мастацкі твор, раскрываць асаблівасці яго зместу і формы,
- разглядаць творы беларускай літаратуры ў кантэксце развіцця сусветнай літаратуры,
- спалучаць тэарэтычныя веды з асэнсаваннем канкрэтных літаратурных з’яў,
- вызначаць месца твора ў творчай сістэме пісьменніка і ў літаратуры ў цэлым,
- раскрываць нацыянальную спецыфіку і аўтарскую інтэпрэтацыю асноўных літаратурных з’яў,
- выкарыстоўваць крытычныя і навуковыя ацэнкі даследчыкаў розных эпох пры аналізе мастацкіх твораў,
- цытаваць на памяць вершы, ўрыўкі з паэм, празаічных твораў, раскрываць іх мастацка-вобразную адметнасць і ідэйна-філасофскую змястоўнасць.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Літаратура даўнейшай Беларусі (X – XVIII стст.)
### Літаратура на старабеларускіх землях у эпоху Кіеўскай Русі (X – XII стст.)

Культурныя дзеячы і пісьменнікі сярэднявяковай Беларусі (К. Тураўскі, Е. Полацкая, К. Смаляціч). Зараджэнне нацыянальнай адметнасці старажытнабеларускай літаратуры, праблема адзінства і шматстайнасці ўсходнеславянскага свету.

"Жыціе Еўфрасінні Полацкай" – арыгінальны помнік агіяграфічнай літаратуры. Вобраз выдатнай хрысціянскай асветніцы і падзвіжніцы Полацкай дзяржавы. Паняцце аб жанры жыція і аскетычным ідэале.

Кірыла Тураўскі – арыгінальны пісьменнік і прамоўца даўнейшай Русі. Духоўнае аблічча і мастакоўская індывідуальнасць пісьменніка. Ідэі царкоўна-хрысціянскага адзінства і пратэст супраць міжусобіц у аповесці "Пра душу і цела" ("Пра сляпога і кульгавага") і малітоўнай паэзіі. Ідэйны змест і мастацкія асаблівасці "Слова па Вялікадні".

"Слова аб палку Ігаравым" (XII ст.) – выдатны помнік гераічнага эпасу ўсходніх славян эпохі Сярэдневякоўя. Вобраз Полацкай зямлі і ідэя палітычнага адзінства ўсходнеславянскіх земляў у барацьбе з ворагамі.

### Старабеларуская літаратура перыяду ўзнікнення і росквіту Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)

Беларускія летапісы як помнікі гісторыі і культуры беларускага народа, іх класіфікацыя і кампазіцыя. Характарыстыка асноўных цыклаў летапісных аповесцяў: пра гісторыю вялікакняскай дынастыі Гедзімінавічаў, міжусобіцы і войны Ягайлы з Кейстутам і Вітаўтам ("Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх"); аб паўстанні "чорнага люду" ў Смаленску (Летапіс 1446 г.); аб заснаванні Вільні і паходжанні літоўскай знаці ад рымлян ("Хроніка Літоўская і Жамойцкая"); аб паходах Альгерда на Маскву, Грунвальдскай бітве 1410 г., княжанні Міндоўга і Войшалка ("Хроніка Быхаўца"). Мастацкія асаблівасці беларуска-літоўскіх летапісаў.

### Літаратура эпохі Адраджэння (першая палова XVI стагоддзя)

М. Гусоўскі і яго паэма «Песня пра зубра». Вобраз радзімы, алегорыя зубра. Паэтызацыя веку Вітаўта, малітва аб міры. Даследаванні.

Жыццёвы і творчы шлях Міколы Гусоўскага (каля 1470 – каля 1533). "Песня пра зубра"(1522) як узор лацінамоўнай рэнесансавай паэзіі Беларусі XУІ ст. Творчая гісторыя паэмы. Асоба паэта-патрыёта, дыпламата і палітыка ў творы. Гераічны хрысціянска-гуманістычны характар паэмы. Сімволіка зубра і вобраз радзімы ў паэме. Настальгія па гераічным мінулым і ідэалізацыя века Вітаўта. Рэнесансавы рэалізм як аснова мастацкага стылю паэмы.

Шматгранная дзейнасць Ф. Скарыны, яго грамадскія, эстэтычныя і маральна-этычныя ідэалы. С. Будны і В. Цяпінскі – паслядоўнікі Ф. Скарыны.

Францішак Скарына (1490-1551) – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, філосаф, мысляр, выдатны прадстаўнік беларускай і еўрапейскай рэнесансавай культуры ХУІ стагоддзя. "Библия руская" (1517-1520), "Малая падарожная кніжка" (1522) і "Апостал" (1525) як фундамент нацыянальнага Адраджэння. Запавет і асноўныя прынцыпы нацыянальна-духоўнага быцця ў прадмовах і пасляслоўях да Бібліі. Сутнасць грамадскіх, філасофскіх, этычных і эстэтычных поглядаў асветніка. Ідэал чалавека і грамадства. Гуманістычная канцэпцыя асобы і формула патрыятызму. Сінтэз традыцый сярэднявечнага рэлігійнага асветніцтва і дыдактызму і свецкай рацыялістычнай рэнесансавай культуры Захаду як аснова мастацкага стылю гуманіста. Кніга Ф.Скарыны як узор мастацтва кнігадрукавання. Вобраз і традыцыі Ф.Скарына ў новай і навейшай беларускай літаратуры.

## Літаратура XIX стагоддзя

Вытокі новай беларускай літаратуры. Дзейнасць філаматаў і філарэтаў. Роля А. Міцкевіча ў фарміраванні эстэтычных прынцыпаў новай літаратуры. Творчасць Я. Чачота, А. Баршчэўскага.

Віленскі універсітэт, дзейнасць філаматаў і філарэтаў. Беларуская школа ў польскім рамантызме. Павышэнне ўвагі да беларускай мовы, да этнаграфіі і фальклору.

Праблематыка паэмаў “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”. Аўтарства, вобразы, мастацкія асаблівасці твораў, іх роля ў развіцці беларускай літаратуры.

Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча: перыядызацыя, жанры, ідэйны змест, стылёвыя асаблівасці яго твораў (“Ідылія”, “Вечарніцы”, “Гапон”, “Пінская шляхта”, “Залёты” і інш.).

Месца і роля В.І. Дуніна-Марцінкевіча ў беларускай літаратуры. Літаратурныя працы, прысвечаныя В.І. Дуніну-Марцінкевічу.

Сацыяльная праблематыка, патрыятычныя і гуманістычныя матывы ў паэзіі Ф. Багушэвіча. Змест прадмоў. Пошукі ў галіне прозы.

Вершаваная аповесць “Кепска будзе!” Пакорлівасць лёсу, праўдашукальніцтва, актыўныя адносіны да жыцця. Вобразы бацькі, айчыма і Аліндаркі. Асуджэнне свету беззаконня і ўціску. Асаблівасць жанравай формы.

Месца і роля Ф. Багушэвіча ў беларускай літаратуры.

## Літаратура пачатку XX стагодддзя

Грамадскі, культурны і літаратурны рух на Беларусі ў пач. XX ст. Роля “Нашай нівы” ў гуртаванні пісьменніцкіх сіл, развіцці літаратуры, прапагандзе ідэй нацыянальнага Адраджэння. “Нашаніўская” дыскусія аб шляхах развіцця літаратуры.

Уплыў рэвалюцыі 1905-1907 гадоў на пашырэнне нацыянальна-вызваленчага руху і на паскарэнне літаратурна-мастацкага працэсу. Развіццё беларускай культуры, яе выдатныя дзеячы (Я.Ф. Карскі, Е.Р.Раманаў, Б.І. Эпімах-Шыпіла, І.Ц. Буйніцкі і інш.). Важнейшыя перыядычныя выданні і выдавецтвы (“Наша доля”, “Наша ніва”, “Загляне сонца і ў наша ваконца”,

“Саха”, “Лучынка”, “Дзянніца”, Друкарня Марціна Кухны і інш.).

Роля “Нашай нівы” ў згуртаванні творчых сіл і развіцця літаратуры. Арганізатары і вядучыя супрацоўнікі газеты (А. Уласаў, А. Луцкевіч, В.Ластоўскі і інш.). Удзел у выданні “Нашай нівы” Я. Купалы, Я. Коласа, Ядвігіна Ш., З. Бядулі, С. Палуяна і інш. Асноўныя напрамкі развіцця літаратуры. Дэмакратызм і народнасць літаратуры, яе роля ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці. Рэалістычная і рамантычная плыні, творчае выкарыстанне фальклору.

Зараджэнне прафесійнай літаратурнай крытыкі. Уплыў яе на фарміраванне грамадскай думкі, на выпрацоўку эстэтычных крытэрыяў мастацкасці (М. Багдановіч, М. Гарэцкі, С. Палуян, В. Ластоўскі, А.Луцкевіч і інш.).

Беларуская проза пач. XX ст. (Ядвігін Ш., Власт, Цётка, З.Бядуля і інш.). Асноўныя тэмы і праблемы. Развіццё празаічных жанраў.

Апрацоўка народных легенд, паданняў, казак, бытавых здарэнняў, алегорыі і імпрэсіі, публіцыстычныя нататкі і замалёўкі, абразкі і эцюды. Станаўленне жанру апавядання, распрацоўка яго кампазіцыі, паглыбленне псіхалагізму, вылучэнне вобразаў-тыпаў, пошукі аналітычнага стылю. Першыя спробы рамана і аповесці. Творчы вопыт Я. Коласа, Власта, Ядвігіна Ш., З. Бядулі, М. Гарэцкага. К. Лейкі, У. Галубка, Ц. Гартнага. Масавая проза на старонках “Нашае нівы”.

Жыццёвы і творчы шлях М. Багдановіча. Зборнік “Вянок”. Багацце духоўнага свету лірычнага героя. Даследаванні творчасці паэта.

Шлях у літаратуру. Дзейнасць М. Багдановіча як паэта, перакладчыка, празаіка, літаратурнага крытыка і публіцыста. Погляды на ролю мастацтва і прызначэнне мастака (“Музыка”, “Песняру” і інш.). Зборнік “Вянок”, яго будова і творчая канцэпцыя. Тэма радзімы як вядучая тэма кнігі. Важнейшыя раздзелы зборніка, аналіз лепшых паэтычных твораў (“Па-над белым пухам вішняў”, “Раманс”, “Слуцкія ткачыхі”, “Санет”, і інш.). Асоба лірычнага героя. Глыбокі роздум над сэнсам жыцця, аб сувязі чалавека з прыродай, ролі духоўнай спадчыны ў жыцці грамадства, сцвярджэнне актыўных адносін да жыцця, вера ў “жыццёвую сілу” народа, у нацыянальнае адраджэнне.

М. Багдановіч як крытык і літаратуразнаўца. Уплыў культурна-гістарычнай школы на фарміраванне яго прынцыпаў крытычнай ацэнкі. Аглядныя артыкулы “Глыбы і слаі”, “За тры гады”. Ацэнка творчасці Я.Купалы, Я. Коласа, А. Гаруна, Власта, Ядвігіна Ш. і інш. “Забыты шлях” як праграма развіцця літаратуры. Ідэя паскоранага развіцця паэзіі. Гісторыка-літаратурная канцэпцыя Багдановіча ў артыкулах “Беларускае адраджэнне”, “Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця”, “За сто лет” і інш.

Творчасць А. Гаруна. Асноўныя матывы і вобразы яго творчасці.

П’есы для дзяцей. Зборнік “Жывыя казкі”. Лёс спадчыны А. Гаруна.

## Літаратура перыяду 20-х гадоў

Літаратурна-грамадскі рух на Беларусі ў 20-я гады. Дзейнасць літаб’яднанняў “Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя”, БелАПП. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці паэзіі, прозы, драматургіі.

Гістарычны час пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі (1917), аб’яўленне БНР і БССР, падзел беларускіх зямель паводле Рыжскай дамовы (1921).

Актыўная беларусізацыя ў Савецкай Беларусі, арганізацыя дзяржаўных тэатраў, бібліятэк, адкрыццё БДУ і іншых навучальных устаноў, праца школ і клубаў. Інбелькульт і яго роля ў развіцці беларускай навукі. Нацыянальна-адраджэнскі рух ў Заходняй Беларусі і яго уплыў на развіццё літаратуры.

Арганізацыя дзяржаўных выдавецтваў, роля часопісаў “Полымя”, “Маладняк”, “Узвышша” ў актывізацыі літаратурнага жыцця. Разнастайнасць тагачаснай перыёдыкі ў Заходняй Беларусі (“Беларуская думка”, “Звон”, “Крыніца”, час. “Родны край”, “Крывіч” і інш.). Прыход у літаратуру творчай моладзі. Дзейнасць літаратурных арганізацый “Маладняк” (1923), “Узвышша” (1926), “Полымя” (1927), БелАПП (1928), іх роля ў літаратурным працэсе свайго часу.

Крытыка і літаратуразнаўства. Дзейнасць М. Гарэцкага, І. Замоціна, А.Вазнясенскага, Я. Барычэўскага, А. Луцкевіча, У. Самойлы, А.Станкевіча. А. Бабарэка як вядучы крытык “Узвышша”, У. Дзяржынскі, Ф. Купцэвіч і інш.

Жыццёвы і творчы шлях Я. Купалы ў “нашаніўскі” перыяд. Тэмы і матывы паэзіі. Вобраз народа і Радзімы, сімвалы яе Адраджэння. Рысы паэтычнага стылю.

Рамантычнае светаадчуванне, асаблівасці паэтыкі Я. Купалы. Рамантычны ідэал, драматызм пачуццяў, вольналюбівыя матывы і гераічны пафас лірыкі. Павышаная экспрэсіўнасць, надзвычайная музычнасць, метафарызацыя, увага да выключнага, прыхільнасць да паэтычнай умоўнасці, сімволікі, маштабных вобразаў. Рытміка-інтанацыйнае багацце верша.

Драматычныя і фальклорна-рамантычныя паэмы Я. Купалы (“Адвечная песня”, “Сон на кургане”, “Курган”, “Бандароўна”, “Магіла льва”, “На Куццю”).

Драматургія Я.Купалы. Праблематыка, вобразы і жанравыя адметнасці твораў (“Раскіданае гняздо”, “Паўлінка”, “Тутэйшыя”і інш.).

Нацыянальныя ідэалы ў паэтычнай і публіцыстычнай творчасці Я. Купалы перыяду акупацый і 20-х гадоў. Жыццёвая і творчая драма паэта ў 30-я гады. Купалазнаўства.

Нацыянальна-адраджэнская скіраванасць, дэмакратычны пафас і сцвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцей ў публіцыстычных артыкулах 1919-1920-х г.: “Больш самачыннасці”, “Незалежнасць”, “Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год”, “Беларускае войска”, “Моладзь ідзе!”, “Справа беларускага нацыянальнага гімна” і інш.

Ілюстрацыйнасць і рыторыка ў паэзіі канца 20-х і 30-х гадоў( “Дыктатура працы”, “Сыходзіш, вёска, з яснай явы”і інш.). Драматычны лёс Купалы ў 30-я гады. Творчы і жыццёвы крызіс. Духоўная апазіцыйнасць ў атмасферы страху, рэпрэсій, даніна часу ў творах той пары і патрыятызм паэта ў час вайны.

Шырокая папулярнасць верша “Беларускім партызанам” у гады Вялікай

Айчыннай вайны. Верш “Зноў будзем шчасце мець і волю”. Публіцыстыка часу Вялікай Айчыннай вайны (“Узнялася Беларусь”, “Беларускі народ не пойдзе ў рабства”, “Вышэй сцяг барацьбы за свабоду і незалежнасць” і інш.).

Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці Я.Купалы – народнага паэта Беларусі (1925).

Жыццёвы і творчы шлях Я. Коласа. Тэматыка і праблематыка апавяданняў пісьменніка, асаблівасці стылю і манеры адлюстравання жыцця.

Паэма “Новая зямля” Я. Коласа – энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства канца XIX – пач. XX ст. Тэма зямлі і трагізм лёсу Міхала. Героі твора, адметнасць мастацкага стылю. Даследчыкі паэмы.

Асаблівасці кампазіцыі, мастацкая роля пейзажных замалёвак, лірычных адступленняў, мова паэмы. Пытанне аб жанры паэмы ў літаратуразнаўстве. Паэма ў кантэксце сусветнай літаратуры. Ацэнка твора ў крытыцы 20-х гадоў і сучасным літаратуразнаўствам.

Праблема нацыянальнага мастака і мастацтва ў паэме “Сымон-музыка” Я. Коласа. Гісторыя напісання. Філасофскі змест, вобразы, асаблівасці формы і стылю твора.

Асаблівасці жанру і кампазіцыі. Роля ўстаўных элементаў, пейзажных малюнкаў, лірычных адступленняў. Рамантычная сімволіка і алегорыя ў паэме (адметны ліст, адзінокі колас, звон, блукаючы прамень, дубок і інш.). Ацэнка паэмы крытыкай і літаратуразнаўствам.

Праблематыка трылогіі Я. Коласа “На ростанях”. Пошукі А. Лабановіча. Вобразы інтэлігенцыі, сялян-палешукоў, чыноўнікаў. Асаблівасці кампазіцыі, стылю. Сэнс назваў.

Асаблівасці кампазіцыі трылогіі, мастацкі стыль, мова, роля пазасюжэтных элементаў. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка, дасканаласць мастацкай дэталі, пейзажныя апісанні і інш. Сэнс назваў аповесцей і трылогіі ў цэлым. Значэнне трылогіі для развіцця беларускай прозы. Літаратуразнаўцы аб творы.

Зборнік “Рунь” М. Гарэцкага. Запіскі “На імперыялістычнай вайне”. Наватарства пісьменніка. М. Гарэцкі – даследчык літаратуры.

Асуджэнне вайны як крывавай бойні, паказ лёсу чалавека на вайне і ў час вайны (“Літоўскі хутарок”, ”Рускі”, “Генерал”, “На этапе”). Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне” (1915-1919). Тэма радзімы, асуджэнне вайны. Праўда пра вайну, аналітызм, рэалізм і гуманістычны, антываенны пафас. Псіхалагічная пераканальнасць вобраза героя-апавядальніка Лявона Задумы. Біяграфічнасць і дакументалізм твора. Наватарства і літаратурны кантэкст (Л. Талстой, А.Барбюс, Э.М. Рэмарк, Э. Хэмінгуэй і інш.)

М. Гарэцкі як даследчык, яго разуменне праблем развіцця літаратуры і адраджэння духоўнага жыцця беларусаў. Эстэтычная каштоўнасць і змест артыкулаў “Наш тэатр”(1913), “Развагі і думкі”(1914). “Гісторыя беларускай літаратуры” (1920), яе чатыры перавыданні. Артыкулы 20-х гадоў (“Маладняк” за пяць гадоў” і інш.).

Аповесць М. Гарэцкага «Дзве душы» і яе месца ў гісторыі беларускай літаратуры. Праблематыка апавяданняў і аповесцяў 20-х гадоў. Даследаванні

жыцця і творчасці М. Гарэцкага.

Гістарычна-палітычны і філасофскі аспекты аповесці “Дзве душы” (1919). Пакутлівыя пошукі свайго месца ў новым жыцці Ігнатам Абдзіраловічам. Сатырычны вобраз Гаршчка, палітычная і маральная няўстойлівасць яго як бальшавіка, так і белагвардзейца Гарэшкі. Вобразы беларускіх інтэлігентаў-адраджэнцаў Ірыны Сакавічанкі, Міколы Канцавога, Сухавея. Грамадзянская празорлівасць мастака, яго трывога за лёс грамадства. Жанр твора.

М.Гарэцкі-драматург. Лепшыя драматычныя абразкі. П’еса “Жартаўлівы Пісарэвіч”, вобраз галоўнага героя.

Творчасць М.Гарэцкага 30-х гадоў (“Віленскія камунары”, “Камароўская хроніка”, “Скарбы жыцця”). Нацыянальнае і агульначалавечае ў раманах, адметнасці жанравай формы і стылю.

Трагічны лёс пісьменніка ў 30-я гады. Грамадзянскі подзвіг мастака.

“Скарбы жыцця” (1932-1937) – споведзь душы пісьменніка. Алегарычнае адлюстраванне трагічных падзей 30-х гадоў. Філасафічнасць, сімволіка ў творы, яго агульначалавечы змест і нацыянальная спецыфіка

Месца і роля пісьменніка ў беларускай літаратуры. Літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя яго творчасці.

Месца паэтаў-узвышэнцаў (У. Дубоўкі, Я. Пушчы, У. Жылкі) у літаратурным працэсе 20-х гадоў і іх творчасць. Ацэнка вульгарызатарскай крытыкай і сучасным літаратуразнаўствам спадчыны паэтаў.

Творчасць К. Чорнага 20-30-х гадоў (“Сястра”, “Зямля”, “Лявон Бушмар”, “Бацькаўшчына”, “Трэцяе пакаленне” і інш.). Ацэнка твораў крытыкай 20-х гадоў і сучасным літаратуразнаўствам.

Творчасць К. Чорнага ваеннага часу. Маральна-філасофская праблематыка яго раманаў “Млечны шлях”, “Пошукі будучыні”, “Вялікі дзень”. Вобразы, адметнасці стылю, жанравай формы.

Паслядоўнікі пісьменніка ў прозе другой паловы ХХ стагоддзя. Спадчына К.Чорнага ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

Творчасць М. Зарэцкага. Праблематыка рамана “Сцежкі-дарожкі”, яго вобразы. Асэнсаванне трагізму эпохі і гуманістычнае гучанне рамана “Вязьмо”. Асаблівасці стылю. Творчасць М.Зарэцкага ў ацэнках савецкага і сучаснага літаратуразнаўства.

Роля А. Мрыя ў развіцці беларускай сатыры, трагізм лёсу пісьменніка. Праблематыка, вобразы, адметнасці стылю рамана “Запіскі Самсона Самасуя”.

Вастрыня і актуальнасць узнятых сацыяльных і маральна-этычных праблем. Універсальнасць смеху ў рамане. Прыёмы і сродкі аўтарскага пісьма: гратэск, карыкатура, парадзіраванне, іронія, сарказм, парадокс і інш. Мрый у кантэксце нацыянальнай і сусветнай літаратур (“Прамова Мялешкі”, Я. Колас, М. Гарэцкі, К. Крапіва, Ф. Рабле, М.Гогаль, М. Салтыкоў-Шчадрын, М. Булгакаў, І. Ільф і Я. Пятроў, А.Платонаў і інш.).

Роля К. Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі і літаратуры ў цэлым. Канфлікты, вобразы, жанравыя адметнасці, ацэнка крытыкай п’ес “Канец дружбы”, “Хто смяецца апошнім”, “Мілы чалавек”, “Брама неўміручасці”. Канкрэтна-гістарычнае і агульначалавечае значэнне твораў.

Сучаснае літаратуразнаўства аб творчасці К.Крапівы 20-30-х гадоў.

Спадчына К.Крапівы ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

**Беларуская літаратура 1966–1990 гадоў**

Паэзія А. Куляшова. Мастацкія пошукі ў жанры паэмы. Праблематыка і жанравая адметнасць паэм "Цунамі", "Далёка да акіяна", "Варшаўскі шлях", "Хамуціус".

Зборнікі паэзіі "Сасна і бяроза" (1970), "Хуткасць" (1976) як працяг творча-эстэтычных традыцый "Новай кнігі". Паэма (цыкл вершаў) "Маналог" (1966) – рэквіем па сябрах юнацтва і творчасці. Увасабленне ідэі лёсу паэта ў таталітарным грамадстве.

А.Куляшоў – перакладчык. Значнасць яго творчага ўкладу ў беларускую літаратуру. Творчасць паэта ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

Творчасць М. Танка заходнебеларускага перыяду. Тэматыка вершаў, адметнасць лірычнага героя-змагара. Праблемы, вобразы, жанравыя асаблівасці паэм "Нарач", "Журавінавы цвет", "Сказ пра Вяля" і інш.

Паэзія М. Танка 60-90-х гадоў. Багацце ўнутранага свету лірычнага героя, разнастайнасць тэматыкі, інтэнсіўнасць мастацкіх пошукаў. Даследаванні творчасці паэта.

Інтэнсіўнасць мастацкіх пошукаў М.Танка 70-80-ых гадоў. Кнігі паэзіі "Хай будзе святло" (1972), "Дарога, закалыханая жытам" (1976), "За маім сталом" (1984). Сэнсавая глыбіня ўмоўна-асацыятыўнага вобразнага ладу вершаў. Узмацненне матываў спавядальнасці, самапакаяння ў паэзіі к. 80-90-ых гадоў. Кнігі "Збор калосся" (1989), "Мой каўчэг" (1994), "Errata" (1995). Асэнсаванне перажытага і зведанага. Адвечныя каштоўнасці чалавечага жыцця і грамадзянская пазіцыя паэта ("Малітва", "Просьба аб дараванні", "Цяпер асцерагайцеся", "Гравюры Скарыны", "Зямля", "Метамарфоза" і інш.). Драматызм светаадчування.

Мастацкія асаблівасці паэтыкі М.Танка: маштабнасць мыслення і светаўспрымання, асацыятыўнасць вобразага ладу, прадметнасць метафары, раскутасць радка. Уплыў паэзіі М.Танка на сучасны літаратурны працэс. Творчасць М.Танка ў ацэнках літаратуразнаўства.

Творчасць П. Панчанкі. Тэматычна-жанравая разнастайнасць паэзіі. Паглыбленне крытычнага пачатку ў творах апошняга перыяду. Даследаванні творчасці паэта.

Тэматычная разнастайнасць паэзіі П.Панчанкі 70-ых –пачатку 80-ых гадоў (зборнікі "Снежань", "Крык сойкі", "Вячэрні цягнік", "Маўклівая малітва", "Лясныя воблакі"). Глыбокі патрыятызм, услаўленне роднай зямлі, сцвярджэнне неразрыўнай еднасці з ёю ("Край паэтаў", "Зямля бацькоў", "Родная мова", "На Палессі восень", "Зямля мая...", "Маўклівая малітва" і інш.).

Тэматычна-праблемная навізна кніг "І вера, і вернасць, і вечнасць"(1986), "Горкі жолуд" (1988), "Высокі бераг" (1993). Узмацненне сатырычна-крытычнага і філасофскага пачаткаў. Бескампраміснасць грамадзянскай пазіцыі паэта.

Творчасць П Панчанкі ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

Творчасць Я. Брыля. Апавяданні і аповесці. Раман “Птушкі і гнёзды”. Лірычныя мініяцюры. Асаблівасці творчай манеры пісьма. Даследаванні творчасці пісьменніка.

Раман “Птушкі і гнёзды”(1963). Творчая гісторыя. Чалавек і радзіма як важнейшая праблема твора. Вобраз Алеся Руневіча. Тэма вайны, асуджэнне фашызму, выкрыццё яго чалавеканенавісніцкай ідэалогіі, сцвярджэнне адзінства людзей розных народаў на агульнай аснове зямнога брацтва. Мастацкая своеасаблівасць твора – жанр, кампазіцыя, стыль, прыёмы стварэння вобразаў, трапнасць і выразнасць мастацкай дэталі.

Дакументальная кніга “Я з вогненнай вёскі” (сумесна з А.Адамовічам і У.Калеснікам).

Маленькая сага “Муштук і папка”(1990). Асэнсаванне трагічных падзей 30-х гадоў.

Кнігі лірычных мініцяцюр, замалёвак і нарысаў “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “Акраец хлеба”, “Сёння і памяць”, “На сцежцы –дзеці”, “Пішу як жыву”, “Вячэрняе”, “Дзе скарб ваш”, “Запаветнае”, “Сцежкі, дарогі, прастор”, “З людзьмі і сам-насам”, “Блакітны зніч”. Лірычна-філасофская заглыбленасць думкі, лаканізм, дасціпнасць, афарыстычнасць мовы. Своеасаблівасць адлюстравання жыцця, асоба апавядальніка.

Я.Брыль і сусветная літаратура. Творы пісьменіка ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

“Палеская хроніка” І. Мележа. Гісторыя напісання, праблематыка, сістэма вобразаў. Майстэрства Мележа –рэаліста.

Палеская вёска 20–30-х гадоў у хроніцы. Паказ натуральнай плыні жыцця народа ў працы і гвалтоўнага руйнавання адвечнага ладу жыцця. Абазначэнне гэтых падзей як драматычных, трагедыйных для лёсу кожнага беларуса. Вобраз народа ў пераломны час гісторыі. Вылучэнне з сялянскай масы каларытных характараў-тыпаў (Нібыто-Ігнат, Чарнушка, Руды і інш.). Паказ сям'і Глушакоў – наватарскае асэнсаванне лёсу заможнага сялянства, драматызму яго становішча пад час калектывізацыі і раскулачвання. Прароцтвы І. Мележа адносна лёсу сялянства і камуністычнай сістэмы.

Тыповасць вобраза Васіля Дзятла. Настойлівае імкненне да самасцвярджэння і незалежнасці. Яго разгубленасць ў складаных жыццёвых абставінах. Вобраз Ганны Чарнушкі. Яе душэўныя пакуты. Майстэрства І. Мележа ў раскрыцці ўнутранага свету персанажаў.

Сюжэтнае завяршэнне лёсаў герояў «Палескай хронікі» ў накідах да раманаў «За асакою бераг», «Праўда вясны».

Этнаграфічна-фальклорны вобраз Палесся і палешукоў у хроніцы. Пісьменніцкая канцэпцыя прыроды-быцця як адной з найвялікшых таямніц, як богастворанага Сусвету. Выяўленне ў вобразе Хадоські самага высокага аспекту прыродаадчування.

Літаратурна-крытычныя выступленні І. Мележа («Жыццёвыя клопаты»). І.Мележ у крытыцы і літаратуразнаўстве.

Творчасць І. Шамякіна. Мнагапланавасць раманаў. Праблематыка твораў, вобразы. Адметнасці стылю пісьменніка.

Іван Шамякін (1921-2004). Шлях у літаратуру. Першыя творы аб Вялікай Айчыннай вайне (апавяданні, аповесць "Помста").

Пенталогія "Трывожнае шчасце" – кніга аб выпрабаваннях маладога пакалення ў дні вайны і пасля яе. Кампазіцыя і творчая гісторыя. Вобразы Пятра Шапятовіча і Сашы Траянавай. Паэтызацыя маладосці, кахання, шчасця ("Непаўторная вясна"). Уславўленне мужнасці і гераізму салдат і афіцэраў, асуджэнне дэмагогіі і кар'ерызму ("Агонь і снег"), паказ партызанскага супраціўлення ("Начныя зарніцы", "Пошукі сустрэчы"). Навізна ў адлюстраванні пасляваеннага жыцця ("Мост"). Рост майстэрства празаіка.

Зварот да мастацкага адлюстравання сённяшняй супярэчлівай рэчаіснасці ў аповесцях "Зямны рай" , "Вернісаж", "Без пакаяння", "Падзенне", "Палеская мадонна" і інш., якія склалі зборнікі "Аповесці Івана Андрэевіча" (1993), "Сатанінскі тур" (1995), "Пошукі прытулку" (2001).

Успаміны пра перажытае ("Дзе сцежкі тыя", "Роздум на апошнім перавале", "Начныя ўспаміны"). Творчасць І.Шамякіна ў ацэнках літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства.

Праблемна-вобразны аналіз драматычных твораў А. Макаёнка. Наватарства драматурга, яго ўклад у жанравае ўзбагачэнне беларускай драматургіі. Даследаванні творчасці.

Асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў трагікамедыі "Трыбунал" (1971). Наватарскі падыход да тэмы гераічнага. Цярэшка Калабок і яго сям'я, праблема даверу між сямейнікамі. Уплыў перадваенных гадоў на псіхалогію і ўчынкі людзей.

Праблемы вясковага жыцця ў камедыі-рэпартажы "Таблетку пад язык". Вастрыня маральна-этычных тэм у трагікамедыі "Пагарэльцы" (1980). Асуджэнне "ўхватаўшчыны", асэнсаванне філасофіі "пагарэльцаў" у вобразах старшыні гарсавета Ухватава і яго акружэння (Бусько, Кураедаў, Клёпкін).

А.Макаёнак у крытыцы і літаратуразнаўстве.

Праблематыка, вобразы, мастацкі стыль твораў В. Быкава 50 – 70-х гадоў. Наватарства пісьменніка і яго роля ў развіцці літаратуры.

Праблема гераізму ў аповесці "Жураўліны крык" (1960). Паводзіны герояў у сітуацыі выбару. Вытокі подзвігу старшыны Карпенкі, Фішара, Свіста, Глечыка. Даследаванні псіхалогіі здрадніцтва. Вобразы Пшанічнага і Аўсеева.

Гісторыя публікацыі і асобныя крытычныя ацэнкі аповесці "Мёртвым не баліць" (1966). Аўтабіяграфізм і наватарства твора. Паказ "унутранай" вайны рэпрэсіўнай сістэмы са сваім народам. Вобраз лейтэнанта Васілевіча. Раскрыццё сутнасці таталітарнай сістэмы праз вобразы Сахно і Гарбацюка. Вобраз немца Энгеля. Ідэйная роля жаночага вобраза ў творы.

Праблематыка і вобразы іншых твораў франтавой тэматыкі ("Праклятая вышыня" (1968), "Яго батальён" (1975), "Дажыць да світання" (1975)).

Адметнасць сюжэтна-кампазіцыйнай будовы быкаўскай аповесці: абмежаванасць часу і прасторы, экскурс у мінулае герояў, трагедыйны пафас, бязлітасны рэалізм і філасафічнасць.

Творчыя пошукі пісьменніка ў другой палове 60-ых – 70-ыя гады. "Партызанская" тэма: асаблівасці жыццёвага матэрыялу, вастрыня маральна-

псіхалагічных канфліктаў і г.д. “Партызанскія” аповесці як роздум В.Быкава аб сапраўднай цане перамогі, аб маральных вытоках народнага подзвігу.

<u>Творчасць В. Быкава 80-х – пач. 2000-х гадоў. Праблематыка аповесцяў, апавяданняў. Вобразы, рысы стылю, наватарскі характар твораў. Даследаванні творчасці пісьменніка.</u>

Паглыбленне мастацкага аналізу ў аповесці “Знак бяды” (1982). Драматызм першых дзён акупацыі. Вытокі гераізму Петрака і Сцепаніды Багацькаў. Услаўленне маральнага свету галоўных герояў і выяўленне асноўнага ідэйнага зместу твора. Рэтраспекцыя як прыём паказу даваеннага жыцця. Трагедыя сям’і Ганчарыкаў. Вытокі маральнага падзення Патапа Каландзёнка, Гужа, Недасекі. Асуджэнне фашызму і сталінізму як сутнасна блізкіх антычалавечых з’яваў. Умоўна-сімвалічныя вобразы ў аповесці (Галгофа, крыж, мёртвы жаваранак, палаючая сядзіба Багацькаў і г.д.). Роля мастацкай дэталі. Філасофская ёмістасць аўтарскай канцэпцыі.

Асэнсаванне лёсу беларускага сялянства ў час калектывізацыі ў аповесці “Аблава” (1989). Вобраз Хведара Роўбы – увасабленне драматызму і трагізму лёсу народа. Маральны свет, жыццёвыя каштоўнасці галоўнага героя: жыць са сваёй працы, быць ашчадным і спагадлівым, чуллівасць, туга па радзіме і г. д. Асуджэнне “новай” маралі праз вобразы Міколы Роўбы, Івана Сокура, Сіўчыка і інш. Роля пейзажу. Выяўленчая роля мастацкіх сімвалаў і дэталяў. Класічная тэма “раскіданага гнязда” і яе ўвасабленне ў быкаўскім творы.

Праблематыка аповесцяў В.Быкава “У тумане” (1987), “Сцюжа” (1991). Паказ аблічча таталітарнай сістэмы і яе бязвінных шматлікіх ахвяр. Актуалізацыя празаікам падзей даваеннага жыцця і выяўленне іх сувязі з падзеямі ваеннага часу.

Новы зварот да жанру апавядання ў 90-ыя гады. Ранейшыя здабыткі ў гэтым жанры (“Адна ноч”, “Сваякі” і інш.). Лаканізм і філасафічнасць быкаўскіх апавяданняў (“На Чорных лядах”, “Перад канцом”, “Жоўты пясочак” і інш.). Прыкметы прыпавесційнасці.

Выяўленне трагізму апошніх дзён вайны і сапраўднай цаны перамогі ў аповесці “Пакахай мяне, салдацік” (1996). Запаўненне нішаў беларускай гісторыі і праўды аб вайне ў аповесці “Балота” (2000).

Паглыбленне ў прозе В.Быкава ўмоўна-філасофскай плыні. Апавяданне “Сцяна” (1995) як вопыт экзістэнцыяльнай прозы. Тыпалагічная блізкасць з творамі Ж.П.Сартра і А.Камю.

Спалучэнне рэалістычнага і ўмоўнага планаў у прозе В.Быкава на тэму сучаснасці (аповесці “Ваўчыная яма” і “Афганец”(2003), апавяданні “Труба”, “Мальбара”, “Доўжык”, “Глухі час начы”, “Дваццаць марак”, “Велікоднае яйка” і інш.). Зборнік прыпавесцяў “Пахаджане” (2000). Кніга ўспамінаў “Доўгая дарога дадому”.

Сінтэз нацыянальнага вопыту і еўрапейскай традыцыі ў прозе В.Быкава. Месца творчасці пісьменніка ў сучасным літаратурным працэсе. Творчасць В.Быкава ў ацэнках літаратуразнаўцаў.

<u>Уклад У. Караткевіча ў развіццё беларускай паэзіі і драматургіі. Разнастайнасць тэм і вобразаў, патрыятычнае гучанне твораў, рысы стылю.</u>

Рамантычная ўзнёсласць і грамадзянская сталасць, асацыятыўная вобразнасць і глыбіня зместу, пранікнёны лірызм і філасафічнасць, патрыятычнае гучанне і гуманістычная скіраванасць паэзіі (вершы «Патрыятычная балада», «Калумбы зямлі незнаёмай», «Гусі-лебедзі ў лугах зялёных», «Беларуская песня», «Скарына пакідае Радзіму», «Быў. Ёсць. Буду», «Фантазія», «Безгаловая Венера» і інш.).

Паэтычныя зборнікі «Вячэрнія ветразі» (1960), «Мая Іліяда» (1969), «Быў. Ёсць. Буду» (1986). Гуманізм паэзіі («Бацькава сэрца», «Слава пра чалавечнасць», «Балада пра смяротнікаў»). Выкрыццё чалавеканенавісніцкай ідэалогіі фашызму.

Сувязь паэзіі з вуснай народнай творчасцю. Спалучэнне баладнасці, эпічнасці з эмацыянальнасцю і лірызмам (вершы «Машэка», «Матчына душа», «Шыпшына і ружа», «Паязджане», «Перакаці-поле», «Балада пра Вячку, князя людзей простых», “Паўлюк Багрым”). Зварот да свабоднага верша, нечаканых гіпербалаў, сімвалаў, параўнанняў, незвычайных вобразаў і г.д.

Своеасаблівасць інтымнай тэмы ў паэзіі. Раздзел «Калі памірае каханне». Спробы зразумець таямніцу і сутнасць кахання. Вобраз ідэальнай жанчыны. Паэзія Караткевіча – рамантычна-ўзнёслая і адначасова інтэлектуальна-філасофская, разважлівая – важкі набытак беларускай літаратуры.

Драматургія. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў гераічнай драме «Млын на Сініх Вірах» (1957). Праблема мужнай самаахвярнасці і здрады. Патрыятычны пафас твора.

Гераічная трагедыя рамантычнага плана «Званы Віцебска» (1974) пра Віцебскае паўстанне 1623 года. Шырыня дзеяння, масавыя сцэны і вобраз народа ў творы. Грамадзянская мужнасць і смеласць аўтара ў паказе мінулага народа, які нельга забіць і ў якога нельга адабраць памяць. Гістарычная асоба Ісафата Кунцэвіча, яго фанатычны дэспатызм і жорсткасць.

Цяжкі шлях да чытача гераічнай драмы «Кастусь Каліноўскі» (1978). Рэальныя гістарычныя асобы і фантастычныя постаці (жанчына ў чорным, юрод).

Драма «Калыска чатырох чараўніц» (1982) – сацыяльна-філасофскі твор пра дзіцячыя і юнацкія гады Я.Купалы. Фантастычна-казачны пралог. Купалаўскія вобразы і тэмы ў канве твора. Філасофскія праблемы.

Трагікамедыя «Маці ўрагану» (1982) – адзін з вяршынных набыткаў драматургіі У.Караткевіча. Падзеі Крычаўскага паўстання 1743-1744 гг. Вобразы Васіля і Агны Вецер. Праблемы асабістага і грамадскага, пачуцця і абавязку. Вобраз Пракажонага – адзін з яркіх і самабытных адраджэнскіх вобразаў беларускай літаратуры. Праяўленне ў творы шматграннага таленту Караткевіча (трагедыйнага, камедыйнага, паэтычнага, аналітычна-даследчыцкага). Аптымістычны пафас твора.

Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў і аповесцяў У. Караткевіча. Патрыятычнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў творах пісьменніка. Даследаванні творчасці У. Караткевіча.

У. Караткевіч як заснавальнік гістарычнай прозы. Адносіны пісьменніка да гісторыі. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» (1958) і паказ

грамадства канца XIX стагоддзя ў яго сацыяльных супярэчнасцях, нацыянальнай, культурнай і гістарычнай своеасаблівасці. Вобраз інтэлігента (Беларэцкі, Свецяловіч). Заняпад беларускай шляхты. Асуджэнне сацыяльнага прыгнёту і тыраніі. Элементы дэтэктыўнага жанру ў творы. Ідэйны змест аповесці «Ладдзя роспачы».

Гістарычная памяць і патрыятычны змест аповесці «Сівая легенда» (1960). Пратэст пісьменніка супраць дэспатызму, жорсткасці, здрады Радзіме. Трагічнае пакаранне Рамана Ракутовіча і Ірыны. Вобраз Беларусі. Праблематыка і вобразы аповесці «Цыганскі кароль».

Аповесць «Чазенія» (1966). Аптымізм твора, сцверджанне прыгажосці і велічы чалавека. Моцная прага герояў да дасканаласці і гармоніі. Гімн красе кахання і прыроды. Вызначэнне пісьменнікам жанру твора. Сімвалічны сэнс назвы.

Антываенны пафас аповесці «Лісце каштанаў». Аўтабіяграфізм твора.

Праца Караткевіча ў публіцыстыцы, літаратурнай крытыцы і мастацкім перакладзе. Нарыс «Зямля пад белымі крыламі» – своеасаблівая мастацкая энцыклапедыя Беларусі. Эсэ і крытычныя артыкулы пра славутых дзеячаў (Ф.Скарыну, Я.Купалу, М.Багдановіча, М.Агінскага, Л.Украінку, М.Шолахава і інш.). Крытычныя артыкулы У.Караткевіча па пытаннях мастацкага перакладу («Будзеш свой сярод чужых», «І наш Фауст»). Пераклады паэзіі, драматургіі, прозы. Пераклад уласных твораў на рускую мову.

Творчасць У.Караткевіча ў ацэнках літаратуразнаўцаў.

Праблематыка, філасофская глыбіня раманаў У. Караткевіча «Нельга забыць», «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Чорны замак Альшанскі». Заслугі пісьменніка ў развіцці нацыянальнай прозы.

Імкненне аўтара па-новаму ацаніць падзеі Вялікай Айчыннай вайны і сучасную яму рэчаіснасць у сацыяльна-псіхалагічным рамане «Леаніды не вернуцца да зямлі» («Нельга забыць») (1960). Праблемы маральна-этычнага і духоўнага плана. Гуманізм твора. Вобразы Ірыны і Андрэя. Значэнне пралога да рамана («Паром на бурнай рацэ»). Вобразы Горава, Пора-Леановіча, жонкі Усяслава Грынкевіча. Сэнс назвы твора.

У. Караткевіч – заснавальнік жанру гістарычнага рамана. Паказ падзей пярэдадня паўстання 1863-1864 гадоў у рамане «Каласы пад сярпом тваім» (1969). Цікавасць пісьменніка да гэтай гістарычнай падзеі. Узнаўленне ў творы атмасферы і духу эпохі. Вобраз Алеся Загорскага, прадстаўніка прагрэсіўна настроенай шляхты – творчая ўдача пісьменніка. Вобразы канкрэтных гістарычных асоб (К.Каліноўскі, В.Дунін-Марцінкевіч, С.Манюшка і інш.).

Паказ жыцця на Беларусі ў XVI ст. у філасофска-гістарычным рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1972) –«Евангелле» ад Караткевіча". Сімволіка-алегарычны план твора. Дух і агульная атмасфера беларускага сярэднявечча. Прыгоды Юрася Братчыка і яго сяброў. Шлях героя ад махляра да народнага заступніка і пакутніка. Сцвярджэнне хрысціянскіх каштоўнасцей у творы. Напоўненасць прыгодніцкага сюжэта сацыяльна-філасофскім і псіхалагічным зместам. Выкарыстанне матэрыялаў хронік, летапісаў, біблейскіх тэкстаў, народных выслоўяў. Мова твора, іранічна-гумарыстычны,

гратэскавы пачатак у творы.

Распрацоўка прыгодніцка-дэтэктыўнага жанру ў рамане «Чорны замак Альшанскі» (1980). Вобразная сістэма твора. Адносіны Антона Косьміча да гісторыі. Паказ жыцця ў яго супярэчнасці, повязь мінулага з сучасным. Неператожнасць і ўсемагутнасць дабра і зла. Філасофскі змест рамана.

Творчасць Л. Геніюш. Вобраз Радзімы, духоўны свет лірычнага героя, адметнасці паэтычнага стылю. «Споведзь» як сведчанне драмы нацыянальна-культурнага адраджэння беларусаў.

Ларыса Геніюш (1910-1983).

Эміграцкікі і савецкі перыяды жыцця паэтэсы. Пачатак творчай дзейнасці.

Зборнік «Ад родных ніў» (1942). Патрыятычны пафас, вобраз Радзімы. Асноўныя матывы паэзіі.

Зборнікі «Невадам з Нёмана» (1967) і «На чабары настоена» (1982). Вызначальныя тэмы, скразныя вобразы. Адметнасць паэтыкі. Ідэйны змест, пафас паэмы Л.Геніюш “Куфар”. Зборнік выбранага “Белы сон” (1990).

Асэнсаванне падзей мінулага роднай зямлі, вершы аб пражытым, роздум аб сучасным і будучым, паэтызацыя прыроды. Вершы, напісаныя ў высылцы.

«Споведзь» як сведчанне аб пражытым і аб сваім часе. Нацыянальная ідэя і хрысціянскія каштоўнасці як аснова жыццёвага і творчага шляху. Асуджэнне таталітарнай сістэмы. Патрыятызм і грамадзянскасць аўтаркі.

Творчасць В. Адамчыка. Тэтралогія “Чужая бацькаўшчына”, “Год нулявы”, “Голас крыві брата твайго”, “І скажа той, хто народзіцца”. Праблематыка, вобразная сістэма, стыль твораў, наватарства пісьменніка.

Сімволіка назваў твораў. Праблема “беларускага шляху”. Калектыўны вобраз народа (адметнасць тыпа Жэніка Рэпкі). Трываласць народнай маралі і цяжар бытавых турбот, адсутнасць вызначальнай ідэі, адлучанасць ад сваёй радзімы як сапраўдная драма народа. Сям’я Корсакаў. Вобраз Уласа, драматызм лёсу Алесі, вобразы Хрысці, Імполя і інш. Міця Корсак як вобраз нацыянальнага інтэлігента, яго пошукі свайго шляху ў жыцці. Праблема кахання (Міця і Чэся і інш.). Зменлівасць і трагізм лёсу галоўнага героя. Паказ трагізму жыцця ва ўмовах фашысцкай акупацыі і “ўнутранай” вайны сістэмы са сваім народам (у апошнім рамане).

Творчасць В. Адамчыка ў ацэнках літаратуразнаўства.

Творчасць І. Чыгрынава. Пенталогія “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”, “Вяртанне да віны”, “Не ўсе мы згінем”

Шырокая панарама жыцця народа на тэрыторыі, часова акупіраванай фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: ад непрыняцця чужынцаў да ўзброенай барацьбы. Вёска Верамейкі і яе жыхары (Кузьма Прыбыткоў, Парфён Вяршкоў і інш.). Народная мараль, абрады і традыцыі Дзяніс Зазыба як увасабленне характару і лёсу народа. Шлях Радзівона Чубара да ўсведамлення сваёй віны. Пераасэнсаванне героямі даваеннай гісторыі. Змагары і кіраўнікі партызанскіх атрадаў. Драматычны лёс, зламаны рэпрэсіўнай сістэмай, Масея Зазыбы - прадстаўніка нацыянальнай інтэлігенцыі. Яго светапогляд, адносіны да вайны, пошукі “беларускага шляху”. Асуджэнне сталінізму, жорсткасці

фашызму. Новыя факты гісторыі перыяду вайны ў асэнсаванні аўтара.

Своеасаблівасць стылю і кампазіцыйнай будовы раманаў. Месца гістарычных дакументаў у мастацкай тканіне твораў.

Творчасць І. Чыгрынава ў літаратуразнаўстве.

**Літаратура 90-х гадоў XX – пачатку XXI стагоддзя**

Сучасная беларуская паэзія. Тэмы, вобразы, творчыя пошукі. Мастацкія суполкі. Творчасць Н. Гілевіча, Р. Барадуліна і інш.

Аб’яўленне незалежнасці Беларусі. Прыняцце Вярхоўным Саветам Дэкларацыі “Аб дзяржаўным суверэнітэце” (27 ліпеня 1990 г.) і закона “Аб наданні статуса канстуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі” (25 жніўня 1991 г.).

Вяртанне ў чытацкі і навуковы ўжытак рэпрэсаваных твораў Я.Купалы, М.Гарэцкага, А.Гаруна, В.Ластоўскага, Ф.Аляхновіча, Л.Геніюш і іншых пісьменнікаў. Шырокае знаёмства грамадскасці з літаратурай беларускага замежжа і Беласточчыны.

Паняцце пра сучасны літаратурны працэс. Пераадоленне літаратурай палажэнняў тэорыі сацыялістычнага рэалізму. Увядзенне ў літаратуру новых тэм і новых жанравых формаў. Напаўненне традыцыйных жанраў новым зместам. Зварот да гістарычнай тэмы, да элементаў прыгодніцтва і фантастыкі. Пашырэнне жанраў высокай паэзіі. Творчыя аб’яднанні і суполкі (“Тутэйшыя”, “Бум-Бам-Літ”, “Фронт мастацтваў”, “Літаратурнае прадмесце” і інш.).

Паэзія. Якасны стан сучаснай паэзіі. Мадэрнізацыя паэтычнай свядомасці. Інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Біблейска-філасофскія і рэлігійна-хрысціянскія матывы (Р. Барадулін, В. Зуёнак і інш.).

Набыткі ў галіне паэтычных жанраў (вершаказы, пункціры, танка, хоку, санеты, рубаі, актавы і г.д.). Праблема традыцый і наватарства. Усведамленне абавязкаў сучаснымі мастакамі слова перад чытачом.

Эстэтычна-стылёвыя плыні ў сучаснай беларускай паэзіі: лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, універсальна-інтэлектуальная.

Суквецце паэтычных талентаў. Самабытнасць, непаўторнасць кожнага. Майстры паэтычнага слова, чыё дзяцінства было абпалена вайною (Н.Гілевіч, А.Вярцінскі, Р.Барадулін, В.Зуёнак, Г.Бураўкін). Пакаленне, народжанае ў цяжкія пасляваенныя гады (С.Законнікаў, А.Разанаў, Н.Мацяш, У.Някляеў, В.Жуковіч і інш.). Паэты, якія радасць творчасці адчулі ў 70-80-я г. (Л.Дранько-Майсюк, А.Бадак, Л.Рублеўская, Э.Акулін, А.Пісьмянкоў, А.Хадановіч і інш.). Тэматычная разнастайнасць сучаснай паэзіі: Радзіма, бацькоўскі дом, родная мова, гістарычнае мінулае, прырода, экалогія, чарнобыльская трагедыя, праца, каханне...

Ніл Гілевіч (1931).

Зборнікі 1990-х гадоў: “Незалежнасьць” (1991), “Жыта, сосны і валуны” (1992), інш. Узмацненне патрыятычнага гучання ў творчасці Н.Гілевіча. Матывы абароны роднай мовы, пытанні непаўнавартасці бязмоўнай нацыі,

адраджэння роднай культуры, абуджэння нацыянальнага жыцця і самасвядомасці – асноўныя тэмы творчасці 90-х гадоў. Узмацненне публіцыстычнага пафасу. Сатырычныя матывы.

Н.Гілевіч як палітычны і грамадскі дзяч: праца ў Вярхоўным Савеце РБ і ў ТБМ.

Рыгор Барадулін (1935).

Пашырэнне кола тэмаў лірыкі Р. Барадуліна ў 90-я гады. З'яўленне чарнобыльскіх матываў, адраджэнскай тэматыкі ("Лямант", "25 сакавіка" і інш.). Навізна тэматыкі зборніка "Евангелле ад мамы" (1995). Рэлігійна-хрысціянскія матывы. Зборнік "Ксты" (2005). Скіраванасць шуканняў да Бога. Духоўныя рэфлексіі і медытацыі, малітвы і псалмы. Спавяданне хрысціянскага гуманізму.

Анатоль Вярцінскі (1931). Паэт інтэлектуальнай, філасофскай паэзіі, драматург, крытык, перакладчык, журналіст.

Схільнасць паэта да аналітычнай эмоцыі, псіхалагізму (зб. "З'яўленне" (1975), "Час першых зорак" (1976), "Ветрана" (1979), "Выбранае" (1973)). Адсутнасць чыста пейзажнай лірыкі. Паэтызацыя хараства прыроды ў сувязі з быційнымі праблемамі (паэма "Начны бераг"). Зварот паэта да забытых літаратурных формаў і жанраў – плач, малітва, прыпавесць, ода, элегія. Распрацоўка новых арыгінальных формаў – дыялог-допыт, анкета, жанр прозапаэзіі. Цяга паэта да ўмоўнасці, прыпавесційнасці ("Мы, мёд і пчала", "Дурман").

Генадзь Бураўкін (1936). Паэт грамадзянскага і публіцыстычнага таленту, тонкі, светлы лірык.

Узмацненне патрыятычнага гучанне вершаў Г. Бураўкіна ў 80-я гады ("Што ты так прыкуты да Радзімы", "Цяжкі застой на Беларусі...", "Беларусі 90-х гадоў"). Актывізацыя грамадска-публіцыстычнага верша ("Адкуль нам лёс яго прынёс...", "Разгублена ўзіраецца Айчына..."). Чарнобыльская тэма ("Брагінская вясна-1986", "Перасяленне"). Уменне паэта востра высмеяць негатыўныя з'явы жыцця (кніга сатыры і гумару "Конь незацугляны").

Філасафізм кнігі лірыкі "Паміж зоркай і свечкай" (2000). Роздум над вечнымі праблемамі жыцця, смерці, любові, чалавечнасці, дабрыні, прыгажосці ("Ці дапаможа нам Расія...", "Ты, помніш мне казаў...", "Ну што, Беларусь, у цябе за сыны?"). Перакладчыцкая дзейнасць Г.Бураўкіна. Грамадзянская пазіцыя мастака слова. Актыўная праца на карысць Бацькаўшчыны. Творчасць паэта ў ацэнках сучаснага літаратуразнаўства.

Сучасная гістарычная проза (Л. Дайнека, У. Арлоў, В. Іпатава, В. Чаропка, Г. Далідовіч, В. Коўтун і інш.).

Шляхі развіцця сучаснай беларускай прозы: традыцыі і наватарства, пошук і эксперымент. Філасофска-эстэтычная эвалюцыя прозы 90-х – пач. XXI ст. Уплыў значных грамадска-гістарычных і сацыяльна-культурных падзей (Чарнобыльская трагедыя, дэмакратызацыя жыцця, абвяшчэнне Незалежнасці, пашырэнне інфармацыйнай прасторы беларушчыны і інш.) на значнасць і вастрыню праблематыкі.

Канцэпцыя мінулага ў рамнах Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі", "След

Ваўкалака”, “Жалезныя жалуды”. Сюжэтныя лініі і ідэйна-мастацкі змест твораў, характарыстыка асноўных вобразаў. Майстэрства аўтара ў пабудове сюжэта (дынамізм, займальнасць, прыгодніцкія калізіі і інш.).

Уладзімір Арлоў (1953). Драматызм сучаснага жыцця ў зборніку “Рэквіем для бензапілы” (1998). Праблематыка і перасанажы кніг “Ордэн Белай Мышы” (2002) і “Адкусі галаву вароне” (2002).Гістарычная тэма. Зборнікі “Дзень, калі ўпала страла” (1998), “Рандэву на манёўрах” (1992), “Пяць мужчын у леснічоўцы” (1994). Увага да вызначальных падзей у жыцці народа, вылучэнне на першы план асоб, “чый лёс уплывае на лёс Айчыны”, прыёмы стварэння запамінальных малюнкаў гістарычнага мінулага ў апавяданнях “Місія папскага нунцыя”, “Міласць князя Гераніма”, “Пяць мужчын у леснічоўцы”, “Рандэву на манёўрах”, аповесцях “Дзень, калі ўпала страла”, “Час чумы”. Аповесць “Сны імператара”.

Вольга Іпатава (1945).

Аповесць “Прадслава” (1971), мастацкае і дакументальнае ў асэнсаванні лёсу Е.Полацкай. Залежнасць лёсу чалавека ад складаных гістарычных падзей у аповесцях “Чорная княгіня”, “Агонь у жылах крэмню”. Раман “За морам Хвалынскім” (1989), драматычны шлях пакут і блуканняў Алексы, яго жаданні стварыць для Радзімы Кнігу, каб “несці словам у свет чысціню і сумленне”.

Адлюстраванне гісторыі Вялікага княства Літоўскага (зб. “Альгердава дзіда”, 2003). Раман “Залатая жрыца Ашвінаў”, час праўлення Міндоўга і Войшалка, сцвярджэнне пераемнасці духоўных каштоўнасцяў у жыцці народа і наканаванасці лёсу кожнага чалавека. Раман “Вяшчун Гедэміна”.

Сучасная беларуская проза. Маральна-філасофская, экалагічная праблематыка. Творчасць В. Казько, А. Жука, В. Карамазава, А. Кудраўца, Г. Марчука і інш.

Ідэалы агульначалавечых каштоўнасцей, гуманізму і праўды ў сучаснай беларускай прозе. Космас чалавечых думак, пачуццяў, перажыванняў. Зварот да складаных праблем сучаснасці.

Літаратурныя згуртаванні “Тутэйшыя” (1987-1992), “Таварыства вольных літаратараў”, “Бум-Бам-Літ” (з 1995 г.), “Новы фронт мастацтваў” і беларускі постмадэрнізм.

Асэнсаванне і ўзвышэнне маральна-этычных каштоўнасцей народнага жыцця, нацыянальных традыцый, агульналюдскіх ідэалаў у творчасці В. Быкава, Я. Брыля, В. Казько, А. Кудраўца, А. Федарэнкі, інш.

Тэма вясковага жыцця ў сучаснай беларускай прозе. Лёс вёскі і яе жыхароў, спрадвечных сялянскіх каштоўнасцей у асэнсаванні В. Карамазава, А. Жука, І. Пташнікава, Г. Далідовіча, А. Наварыча і інш. Жыццёвая канкрэтыка, вясковы каларыт, трывогі і надзеі.

Тэма чарнобыльскай трагедыі і паслячарнобыльская рэчаіснасць у творчасці В.Казько, І.Шамякіна, І.Пташнікава, В.Карамазава, С.Алексіевіч і інш.

Віктар Казько (1940).

Праблематыка рамана “Неруш” (1981). Тэмы прыроды, вёскі, экалогіі. Сэнс назвы твора. Супярэчлівасць характару галоўнага героя Мацвея Роўбы.

Увасабленне ідэі адказнасці чалавека за ўсё, што адбываецца вакол яго. Спалучэнне маральна-этычнага і сацыяльна-псіхалагічнага зместу. Вобраз Шахрая – бяздумнага выканаўцы авантурных планаў пакарэння прыроды. Мэтазгоднасць у творы кампазіцыйнага прыёму некалькіх часавых праекцый – мінулага, сённяшняга, будучага. Міфалагічныя вобразы-сімвалы ў творы (Жалезны чалавек, Галоска-галасніца і інш.), іх роля ў выяўленні філасофска-этычнай заглыбленасці аўтарскай задумы. Сцвярджэнне ідэі гістарычнай памяці народа.

Раман "Хроніка дзетдомаўскага сада" (1987) як падагульненне мастацкіх пошукаў В. Казько. Увасабленне тэмы вайны і ўзаемасужыцця чалавека з прыродай. Лёсы Мар'яна Знаўца і Сідара Місцюка. Гісторыя і лёс дзетдомаўскага саду як мастацкае асэнсаванне драматычнай беларускай гісторыі. Сад як сімвалічная ідэя захавання памяці аб мінулым і будучым роднай зямлі. Вобраз-сімвал Сноўдалы.

Драматызм, псіхалагічная заглыбленасць аповесцяў "Но пасаран" (1990), "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" (1991), "Прахожы" (1995).

Раман "Бунт незапатрабаванага праху" (2000). Экзістэнцыяльныя праблемы, асэнсаванне гісторыі і сучаснасці. Біблейскія матывы і вобразы. Умоўна-алегарычны і філасофскі змест твора. Вобраз Германа. Аповесць "Час збіраць косці" (2005). Асаблівасці творчай манеры празаіка: філасафізм, адкрытая публіцыстычнасць стылю, сімволіка-алегарычная вобразнасць. Крытыкі і літаратуразнаўцы аб творчасці В. Казько.

<u>Віктар Карамазаў (1934).</u>

Філасофія чалавека і прыроды ў рамане "Пушча" (1978). Сімвалічна-абагульнены вобраз-матыў Пушчы як "храма, сабора, дзе правіцца культ чысціні, аднолькава значны і для чалавека, і для яго меншых суседзяў па Пушчы" (П. Васючэнка).

Раман "Бежанцы" (1990) як мастацкае ўвасабленне драмы маленькага чалавека на дарогах вайны. Матыў бежанства як сімвалічнае асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны. Асацыятыўная сугучнасць рамана "Бежанцы" з творамі М. Гарэцкага "Жартаўлівы Пісарэвіч", "Сібірскія абразкі". Спалучэнне двух часавых пластоў – Вялікай Айчыннай вайны і постчарнобыльскай сучаснасці. Вобразы Васіля Падабеда, яго дзеда Трахіма, бацькі Захара і сына Сярожы. Вобразы дзетдомаўцаў (Раман, Лёха).

Гісторыка-філасофскія праблемы лёсу беларускага народа і нацыі ў аповесці "Краем белага шляху". Думка аб трагізме асобы ў бюракратычнай дзяржаве. Сутнасць аўтарскай канцэпцыі, увасобленай у вобразна-метафарычнай сістэме аповесці-трагедыі "Цэзары і Зона". Вобраз доктара Валетава. Асуджэнне духоўнага "чарнобылю". Матывы апакаліпсісу і Аброчнага крыжа ў творы.

Мастацкае асэнсаванне лёсу жывапісца Бялыніцага-Бірулі ў аповесці-эсэ "Крыж на зямлі і поўня ў небе". Матыў творчых пакутаў і болю асобнага чалавека як адзін са шляхоў спасціжэння свету. Карамазаўскія творы і героі ў ацэнках сучаснага літаратуразнаўства і крытыкі.

<u>Анатоль Кудравец (1936).</u> Раман "Сачыненне на вольную тэму" ("Пасеяць

жыта”) (1984). Вобраз Ігната Вапшчэткі як глыбокі народны характар. Выпрабаванне героя лёсам. Аналітычна-філасофскі падыход да жыцця. Сувязь рамана з літаратурнай традыцыяй: сяброўства сямідзесяцігадовага чалавека і вучня дзевятага класа Валеры. Прыпавесційна-павучальны характар твора. Ёмістасць сістэмы маральных каштоўнасцей, сцверджаных у творы.

Увасабленне трагічнага лёсу беларускіх інтэлігентаў-адраджэнцаў у апавяданні “Смерць нацыяналіста”. Выкрыццё таталітарнай сістэмы. Асуджэнне “памяркоўнага” хрушчоўска-брэжнеўскага рэжыму, абыякавасці “сузіральнікаў” драмы чалавечага жыцця. Вобраз Віктара Мацюшонка як увасабленне прынцыпу высокай самапатрабавальнасці асобы.

Майстэрства празаіка. Уменне ўзнаўляць аблічча эпохі ў кароткай жанравай форме і ствараць партрэт часу праз лёс чалавека. Творчасць А.Кудраўца ў ацэнках крытыкаў і літаратуразнаўцаў.

Алесь Жук (1947). Чалавек і прырода ў аповесці “Паляванне на Апошняга Жураўля” (1982). Самаахвярнасць Сцяпана Дзярмідчыка ў барацьбе за захаванне прыродных багаццяў, хараства навакольнага свету. Паказ хціваcці, нахабнага ўрвіцельства наменклатурных чыноўнікаў. Арыгінальнасць сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора (легендарна-казачныя і сімвалічныя элементы, змена падзейна-часавых ракурсаў).

Маральна-этычная праблематыка аповесці “Праклятая любоў (1989). Вобраз Яна Кулешы. Працавітасць, гаспадарлівасць, душэўная неўладкаванасць героя. Запозненае каханне Яна да Галі Русакевіч. Умяшанне ў інтымную сферу партыйных кіраўнікоў, трагедыя чалавека ў рэгламентаваным грамадстве.

Творы Алеся Жука 90-х гадоў (апавяданні “Душа над чыстым полем”, “Партызан”, аповесць-эсэ “Сны пра маму”. Напружаны роздум над жыццём, арыгінальнасць мастацкага свету, населенага жывымі постацямі герояў нашых дзён.

І. Пташнікаў. Раман “Мсціжы” (1972). Псіхалагічны канфлікт твора. Жыццёвая драма Андрэя Вялічкі, яго адносіны да сям’і, людзей, прыроды, родных мясцін, непрыманне прыстасавальніцтва, спажывецтва, бездухоўнасці. Іншыя персанажы. Адметнасць мовы і вобразна-выяўленчых прыёмаў увасаблення жыцця і характараў дзеючых асоб.

Раман “Алімпіяда” (1985). Шырокая панарама тагачаснага жыцця, зварот да падзей Вялікай Айчыннай вайны. Увасабленне ў характары галоўнай гераіні лёсу народа, яго працавітасці, нязломнасці, чалавечнасці, жыццястойкасці. Вобразы прадстаўнікоў маладога пакалення, пошукі маладымі свайго месца ў жыцці.

Апавяданні апошніх гадоў. Аналіз лепшых твораў: “Эфка” (1983), “Львы” (1987), “Французжанкі” (1997), “Тры пуды жыта” (1998), “Пагоня” (1999) і інш. Майстэрства празаіка.

Сучасная беларуская драматургія. Творчасць А. Дударава, М. Матукоўскага, У. Бутрамеева, М. Арахоўскага, І. Сідарука і інш.

Шляхі абнаўлення паэтыкі ў драматургіі “новай хвалі”: абсурдысцкая і герменеўтычная беларуская п’еса. Ірацыянальны пачатак, псіхалагізм, парадаксальнасць, сімвалізм, эксперымент, гульня, дэканструктывізм і іншыя

якасці п’ес “новай хвалі”. П’есы-адаптацыі, рэпрадукцыі, кантамінацыі, п’есы-гульні, фальклорныя варыяцыі, гістарычныя фантазіі і інш. “Новая п’еса” супраць стэрэатыпаў традыцыйных, маральных каштоўнасцей у п’есах маладых драматургаў: У. Бутрамеева, А. Асташонка, С. Кавалёва, І. Сідарука, У. Сауліча, М. Адамчыка, Ю. Станкевіча, і інш.

Герменеўтычная п’еса, “рэмейкерства” С. Кавалёва (“Стомлены д’ябал”, “Звар’яцелы Альберт”, “Саламея”, “Блазан на пахаванні”, “Балада пра Бландою”, “Францішка, або Навука кахання” і інш.).

Фарс-абсурд І. Сідарука “Галава”. Абсурдысцкая паэтыка, вобразы-маскі ў творы, сюжэтная зададзенасць і схематызм.

Казкі-прыпавесці П. Васючэнкі. Ідэя самаахвярнасці, рамантыка, парадоксы і метамарфозы ў п’есах “Стражнік Гам”, “Маленькі збраяносец”, “Новы калабок” і інш. Сцвярджэнне гуманістычных каштоўнасцей, перамогі дабра над злом, рыцарства і высакароднасць.

Сатыра і гумар у новай беларускай п’есе. Спалучэнне рэальнага і містычнага, трагічнага і камічнага ў п’есах У. Сауліча (“Сабака з залатым зубам”, “Халімон камандуе парадам”), Г. Марчука (“Дэфіцытны жаніх”, “Блудны муж і Варвара”, “Люцікі-кветачкі”), А. Федарэнкі (“Жаніх па перапісцы”), А. Ждана, М. Казачонка і інш.

П’еса У. Бутрамеева “Страсці па Аўдзею” (“Крык на хутары”). Праблема зямлі і ўласнасці ў творы. Сутнасць трагедыі галоўнага героя п’есы. Вобраз Аўдзея як гаспадара, сем’яніна, беларуса. Сацыяльнае і нацыянальнае ў творы. Характар і лёс героя.

Філасафічнасць, псіхалагізм, фантастычнасць п’ес “Армагедон – 1895”, “Шэва” і “Псеўда” Ю. Станкевіча. Тэмы Страшнага суда, змагання дабра і зла, наканаванасці чалавецтва ў творах.

Праблемы сэнсу жыцця, духоўных пошукаў, кахання і смерці ў драме “Страчаны рай” А. Курэйчыка. Наватарства ў падыходзе да тэмы віны і адказнасці чалавека перад Богам, грэхападзення і вечнага блукання ў пошуках страчанага раю. Інтэрпрэтацыя нацыянальнай ідэі ў творы.

Аляксей Дудараў (1950). Драматургія 90-х гадоў. Творчыя пошукі (“Адцуранне” (1994), “У прыцемках”). Зварот да гістарычнай тэматыкі (“Купала”, “Палачанка”, “Чорная панна Нясвіжа” (1998), “Крыж” (2000). Пераклады-адаптацыі з Шэкспіра. Новы герой А.Дударава. Арыентацыя на пазітыўнае, выхад да філасофскай праблематыкі.

М. Матукоўскі (1929-2001). Камедыя-фарс “Калізей” (1995). Умоўнасць жанрава-стылёвых сродкаў п’есы. Погляд Матукоўскага на праблему ўзаемаадносін улады і народа.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## Літаратура


1. Адамовіч, А. "Браму скарбаў сваіх адчыняю..." / А. Адамовіч. – Мінск, 1980.
2. Адамовіч, А. М. Маштабнасць прозы: Урокі творчасці Кузьмы Чорнага / А.М. Адамовіч. – Мінск, 1972.
3. Афанасьев, Н. Кто восходит на Голгофу? : Антивоенная идея в творчестве В. Быкова / Н. Афанасьев. – Мінск, 1993.
4. Афанасьеў, І. Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры / І. Афанасьеў. – Мінск, 2001.
5. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя : Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск, 2001.
6. Багдановіч, І. Э. Янка Купала і рамантызм / І. Э. Багдановіч. – Мінск, 1989.
7. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80-90-я гг.) : дапам. для наст. / А. І. Бельскі. – Мінск, 1997.
8. Бечык, В. Шлях да акіяна : Кн. пра паэзію А. Куляшова / В. Бечык. – Мінск, 1981.
9. Бугаёў, Д. Вернасць прызванню : Творчая індывідуальнасць І. Мележа / Д. Бугаёў. – Мінск, 1977.
10. Бугаёў, Д. Зброяй сатыры, зброяй праўды / Д. Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск, 2004.
11. Бугаёў, Д. Максім Гарэцкі / Д. Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск, 2003.
12. Бугаёў, Д. Паэзія Максіма Танка / Д. Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск, 2003.
13. Бугаёў, Д. Уладзімір Дубоўка : Кн. пра паэта / Д. Бугаёў. – Мінск, 2005.
14. Бярозкін, Р. Аркадзь Куляшоў: Нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін. – Мінск, 1978.
15. Бярозкін, Р. Чалавек напрадвесні: Расказ пра Максіма Багдановіча / Р. Бярозкін. – Мінск, 1986.
16. Васючэнка, П. В. Беларуская літаратура ХХ ст. і сімвалізм / П.В. Васючэнка. – Мінск, 2004.
17. Васючэнка, П. В. Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П. В. Васючэнка. – Мінск, 1994.
18. Васючэнка, П. В. Пошукі страчанага дзяцінства: Бел. празаікі "сярэд. пакалення" аб Вялікай Айчыннай вайне / П. В. Васючэнка. – Мінск, 1995.
19. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. – Мінск, 2000.
20. Верабей, А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. – Мінск, 1997.
21. Верабей, А. Уладзімір Караткевіч: Жыццё і творчасць /

А. Верабей. – 2-е выд. – Мінск, 2005.
22. Гараднiцкi, Я. А. Думка i вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучас. бел. лірыцы / Я. А. Гараднiцкi. – Мінск, 1986.
23. Гарэлік, Л. Зямля дала мне права: Станаўленне творчай індывідуальнасці Р. Барадуліна / Л. Гарэлік. – Мінск, 1983.
24. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск, 1999-2003. – 4 т.
25. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра бел. паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск, 2001.
26. Гніламёдаў, У. В. Янка Купала: Жыццё і творчасць / У. В. Гніламёдаў. – Мінск, 2002.
27. Гніламёдаў, У. Іван Мележ: Нарыс жыцця і творчасці / У. Гніламёдаў. – Мінск, 1984.
28. Гніламёдаў, У. Класікі і сучаснікі / У. Гніламёдаў. – Мінск, 1987.
29. Грамадчанка, Т. К. Жывая памяць народа: Нарыс творчасці І. Чыгрынава / Т.К. Грамадчанка. – Мінск, 1984.
30. Драздова, З. У. Творчасць А. Мрыя і А. Калюгі: Стылявыя асаблівасці / З.У. Драздова. – Мінск, 1997.
31. Жук, І. Сустрэчны рух: Літаратуразн. эцюды / І. Жук. – Гродна, 1998.
32. Жураўлёў, В. П. На шляху духоўнага самасцвярджэння / В. П. Жураўлёў. – Мінск, 1995.
33. Жураўлёў, В. П. У пошуку духоўных ідэалаў: На матэрыяле бел. літ. XIX — пачатку XX стст. / В. П. Жураўлёў. – Мінск, 2002.
34. Каваленка, В. А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць / В. А. Каваленка. – Мінск, 1975.
35. Каваленка, В. А. Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці / В. А. Каваленка. – Мінск, 1980.
36. Каваленка, В. Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. Каваленка. – Мінск, 1981.
37. Кавалёў, С. Партрэт шкла / С. Кавалёў. – Мінск, 1991.
38. Казбярук, У. М. Светлай волі зычны звон: А. Гарун / У. М. Казбярук. – Мінск, 1991.
39. Калеснік, У. Ветразі Адысея: У. Жылка і рамантыч. традыцыя ў бел. паэзіі / У. Калеснік. – Мінск, 1977.
40. Калеснік, У. Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск, 1981.
41. Калеснік, У. Тварэнне легенды / У. Калеснік. – Мінск, 1987.
42. Калеснік, У. Усё чалавечае / У. Калеснік. – Мінск, 1993.
43. Калеснік, У. Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск, 1990.
44. Кісліцына, Г. Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці / Г. Кісліцына. – Мінск, 1997.
45. Кісялёў, Г. Загадка беларускай “Энеіды” / Г. Кісялёў. – Мінск, 1971.

46. Кісялёў, Г. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча / Г. Кісялёў. – Мінск, 1988.
47. Кісялёў, Г. Сейбіты вечнага / Г. Кісялёў. – Мінск, 1963.
48. Конан, У. Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка М. Багдановіча / У. Конан. – Мінск, 1991.
49. Короткий, В. Г. Творческий путь Мелетия Смотрицкого / В.Г. Короткий. – Минск, 1987.
50. Коршунов, А. В. Афанасий Филипович. Жизнь и творчество / А.В. Коршунов. – Минск, 1965.
51. Коўтун, В. Стала песняй у народзе: Нарыс жыцця і творчасці Цёткі / В. Коўтун. – Мінск, 1998.
52. Лаўшук, С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск, 2002.
53. Лецка, Я. Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці В. Адамчыка / Я. Лецка. – Мінск, 1985.
54. Лойка, А. А. Старабеларуская літаратура / А. А. Лойка. – Мінск, 2001.
55. Лойка, А. Галгофа: Кн. лёсаў / А. Лойка. – Слонім, 2001.
56. Локун, В. І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы (1950-1960-я гг.) / В. І. Локун. – Мінск, 1995.
57. Лявонава, Е. А. Агульнае і адметнае: Творы бел. пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літаратуры / Е. А. Лявонава. – Мінск, 2003.
58. Макарэвіч, А. М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А. М. Макарэвіч. – Магілёў, 1999.
59. Максімовіч, В. А. Шыпшынавы край: Старонкі бел. літ. 20-30-х гг. XX ст. : дапам. для наст. / В. А. Максімовіч. – Мінск, 2002.
60. Максімовіч, В. А. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя : дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ / В. А. Максімовіч. – Мінск, 2000.
61. Мальдзіс, А. Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партр. пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск, 1990.
62. Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск, 1982.
63. Марціновіч, А. Іван Чыгрынаў: Нарыс жыцця і творчасці / А. Марціновіч. – Мінск, 1998.
64. Мельнікава, З. П. "На горне душы..." : Творчасць З. Бядулі і бел. літ. першай трэці XX ст. / З. П. Мельнікава. – Брэст, 2001.
65. Мікуліч, М. У. Максім Танк і сучасная беларуская лірыка / М. У. Мікуліч. – Мінск, 1994.
66. Мішчанчук, М. І. Беларуская савецкая паэзія 20-30-х гадоў / М. І. Мішчанчук. – Мінск, 1988.
67. Мішчанчук, М. І. Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучас. бел. лірыкі / М. І. Мішчанчук. – Мінск, 1992.
68. Мішчанчук, М. І., Шпакоўскі, І. С. Беларуская літаратура XX ст.: вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мінск, 2001.

69. Мушынскі, М. І. І нічога, апроч праўды: Якой быць “Гісторыі беларускай літаратуры" / М. І. Мушынскі. – Мінск, 1990.
70. Мушынскі, М. І. Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці / М. І. Мушынскі. – Мінск, 1982.
71. Мушынскі, М. Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці М. Зарэцкага / М. Мушынскі. – 2-е выд. – Мінск, 2005.
72. Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – 2-е выд. – Мінск, 2004.
73. Навуменка, І. Я. Максім Багдановіч / І. Я. Навуменка. – Мінск, 1997.
74. Навуменка, І. Я. Ранні Кузьма Чорны (1923-1929) / І. Я. Навуменка. – Мінск, 2000.
75. Навуменка, І. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч / І. Навуменка. – Мінск, 1992.
76. Саверчанка, І. В. Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар / І. В. Саверчанка. – Мінск, 1993.
77. Саверчанка, І. В. Канцлер Вялікага княства : Леў Сапега / І. В. Саверчанка. – Мінск, 1992.
78. Саверчанка, І. В. Старажытная паэзія Беларусі : XVI – першая палова XVII ст. / І. В. Саверчанка. – Мінск, 1992.
79. Сабалеўскі, А. В. Кандрат Крапіва : Постаць і творы / А. В. Сабалеўскі. – 2-е выд. – Мінск, 2003.
80. Сачанка, Б. Сняцца сны аб Беларусі... / Б. Сачанка. – Мінск, 1990.
81. Семяновіч, А. А. Гісторыя беларускай драматургіі / А. А. Семяновіч. – Мінск, 1985.
82. Сіненка, Г. Ніл Гілевіч : Нарыс творчасці / Г. Сіненка. – Мінск, 1981.
83. Стральцоў, М. Загадка Багдановіча / М. Стральцоў. – Мінск, 1969.
84. Тарасюк, Л. Апалогія красы : Кн. пра бел. паэзію / Л. Тарасюк. – Мінск, 2003.
85. Тычына, М. Карані і крона: Фальклор і літ. / М. Тычына. – 2-е выд. – Мінск, 2002.
86. Тычына, М. Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мыслення / М. Тычына. – 2-е выд. – Мінск, 2004.
87. Усікаў, Я. Андрэй Макаёнак : Нарыс жыцця і творчасці / Я. Усікаў. – Мінск, 1984.
88. Чамярыцкі, В. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры / В. Чамярыцкі. – Мінск, 1969.
89. Чарота, І. А. Пошук спрадвечнай існасці : Бел. літ. ХХ ст. у працэсах нац. самавызначэння / І. А. Чарота. – Мінск, 1995.
90. Чыгрын, І. П. Крокі: проза "Узвышша" / І. П. Чыгрын. – Мінск, 1989.
91. Чыгрын, І. П. Проза "Маладняка" / І. П. Чыгрын. – Мінск, 1985.
92. Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: Проза М. Гарэцкага /

І.П. Чыгрын. – 2-е выд. – Мінск, 2003.
93. Шамякіна, Т. І. Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія / Т.І. Шамякіна. – Мінск, 2001.
94. Шамякіна, Т. На лініі перасячэння / Т. Шамякіна. – Мінск, 1981.
95. Штэйнер, І. Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру / І. Штэйнер. – Мінск, 2003.
96. Шупенька, Г. Прага мастацкасці / Г. Шупенька. – Мінск, 1996.
97. Шынкарэнка, В. К. Нястомных пошукаў дарога: Праблемы паэтыкі сучас. бел. гістарычнай прозы / В. К. Шынкарэнка. – Мінск, 2002.
98. Янка Купала: Энцыкл. давед. – Мінск, 1986.
99. Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар Адраджэння: В. Ластоўскі / Я. Янушкевіч. – Мінск, 1995.
100. Ярош, М. Р. Пясняр роднай зямлі: Жыццё і творчасць Я. Купалы / М.Р. Ярош. – 2-е выд. – Мінск, 2003.